З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗВЯРНУЦЬ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА ФАРМІРАВАННЕ ДАХОДНАЙ ЧАСТКІ БЮДЖЭТУ»

Учора Прэзідэнт прыняў з дакладам старшыню Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрыя Сянько

«Прашу звярнуць асаблівую ўвагу на фарміраванне даходнай часткі бюджэту. Ці выкананы прагнозныя паказчыкі? — акрэсліў рэчышча даклада кіраўнік дзяржавы. — І другое пытанне — фарміраванне даходнай часткі бюджэту ў плане маіх даручэнняў напрыканцы мінулага года. Вы ведаеце, пра што ідзе размова. Я хацеў бы пачуць, як спрацавала ваша ведамства».

Паказчык перавыкананы

Старшыня ДМК паведаміў кіраўніку дзяржавы, што прагнозны паказчык па мытных плацяжах у рэспубліканскі бюджэт, які быў даведзены Мытнаму камітэту Міністэрствам фінансаў, выкананы на 100,5 працэнта.

За 2019 год у рэспубліканскі бюджэт паступіла 9 мільярдаў 65 мільёнаў рублёў плацяжоў, якія кантралюе Мытны камітэт, што амаль на 400 мільёнаў рублёў менш у параўнанні з 2018 годам. **Адной з прычын змяншэння паступленняў у бюджэт стала зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці ў нафтавай галіне і вывазных мытных пошлін на экспарт нафтапрадуктаў** (на 33 працэнты). Па іншых плацяжах адбыўся рост.

Летась праз граніцу Беларусі было перамешчана 111 мільёнаў тон тавараў. Гэта прыблізна на 3 мільёны менш, чым у 2018 годзе. У асноўным такі спад абумоўлены зніжэннем транзіту вугалю з Расіі чыгункай. Пры гэтым **агульны транзітны паток пры ўвозе тавараў на тэрыторыю ЕАЭС праз Беларусь вырас на 5,4 працэнта і склаў 17,5 мільёна тон (у тым ліку 11,4 мільёна тон — у Расію).** Да 2,3 мільёна ўзрасла і колькасць грузавікоў, якія перасяклі беларускую граніцу.

Транзітны патэнцыял

70 працэнтаў тавараў, якія афармляюцца на беларускай граніцы, — транзітныя, удакладніў Юрый Сянько. З іх 80 працэнтаў адпраўляецца ў Расію альбо з яе. «Хоць мы на 70 працэнтаў працуем на сваіх суседзяў, у інфраструктуру ўкладваем сродкі беларускага бюджэту і міжнароднай тэхнічнай дапамогі. За апошні год яе было прыцягнута на суму 23 мільёны еўра, з іх 12 ад Кітая і 11 ад Еўрасаюза. Гэта сродкі тэлекамунікацыі і іншая тэхніка», — адзначыў старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта.

«Выконваецца даручэнне кіраўніка дзяржавы, звязанае з развіццём інфраструктуры на найбольш запатрабаваных напрамках — заходнім і паўночным. У тым ліку завяршаецца будаўніцтва пункта пропуску «Урбаны». Яно цалкам фінансуецца з бюджэту. Асвоена 34 мільёны беларускіх рублёў, у першым квартале гэтага года першы пускавы комплекс будзе завершаны. Цяпер ідзе пераразмеркаванне плыняў са старой інфраструктуры на новую, і да канца года нам неабходна будзе дабудаваць рэнтген-комплекс, які будзе пабудаваны за кошт міжнароднай тэхнічнай дапамогі, сродкаў Еўрапейскага саюза», — праінфармаваў Юрый Сянько.

Фота БелТА.

Пункт мытнага афармлення «Вялікі камень» мінскай рэгіянальнай мытні.

Заслон наркотыкам

Кіраўніку дзяржавы было таксама даложана, што сітуацыя па лініі барацьбы з наркотыкамі застаецца складаная. **З амаль чатырох соцень злачынстваў, здзейсненых на граніцы Беларусі, прыкладна палова была звязаная з незаконным абарачэннем псіхатропаў.** «Чатыры самыя буйныя партыі наркотыкаў — усяго амаль 500 кілаграмаў — накіроўваліся ў Расійскую Федэрацыю, але былі знойдзеныя на нашай граніцы і канфіскаваныя», — дадаў Юрый Сянько.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Доўгія кантракты, водпуск для бацькі і іншыя змяненні...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Цяпер, згодна з абноўленым Працоўным кодэксам, работнік, які адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, зможа разлічваць на больш працяглы кантракт. Напрыклад, калі работнік упершыню ўладкоўваецца на прадпрыемства, з ім можна заключыць кантракт на год. Але далей, калі наймальнік хоча працягнуць працоўныя адносіны, ён абавязаны прапанаваць таму кантракт на максімальны тэрмін дзеяння — гэта значыць да пяці гадоў. Калі па заканчэнні пяцігадовага тэрміну наймальнік і работнік зноў маюць намер працягваць працоўныя адносіны, новы кантракт павінен быць адразу на тры гады. На меншыя тэрміны кантракты можна працягваць толькі з пісьмовай згоды работніка.

ГАРАНТЫІ ПЕРАД ПЕНСІЯЙ

Работадаўца таксама абавязаны прадоўжыць кантракт з работнікам перадпенсійнага ўзросту не менш чым за два гады да надыходу права на атрыманне пенсіі. Калі ж скончыўся максімальны, пяцігадовы тэрмін кантракта, то павінен заключыць новы. Умова для работніка пры гэтым толькі адна: ён павінен добрасумленна ставіцца да працы.

ПРА ЧАСОВЫ ПЕРАВОД НА ІНШУЮ РАБОТУ

Таксама адрэгуляваны парадак часовага пераводу са згоды работніка на іншую работу, калі ёсць вакансіі, у тым ліку да іншага наймальніка, на тэрмін да шасці месяцаў. Раней, пагаджаючыся на такі перавод, чалавек не заўсёды быў упэўнены, што ён застанецца працаваць у гэтай арганізацыі, гэта значыць не былі забяспечаны яго гарантыі. «У абноўленым Працоўным кодэксе прапанаваны такі досыць зручны варыянт, калі можна, вызваліўшы ад ранейшай пасады, перавесці работніка з яго згоды на шэсць месяцаў на іншую работу, — тлумачыць **начальнік галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна МАСЛОЎСКАЯ.** — Пры гэтым яму будзе гарантавана вяртанне на ранейшае рабочае месца. І яшчэ адзін важны момант: гарантаванае захаванне заработнай платы. Так, калі зарплата па іншай пасадзе вышэйшая, ён будзе атрымліваць зарплату па выкананай рабоце. Але калі раптам яна ніжэйшая, то заработная плата будзе захоўвацца».

ДЫСТАНЦЫЙНАЯ РАБОТА: БОЛЬШ СТАБІЛЬНАСЦІ

Апошнімі гадамі можна назіраць усё больш выпадкаў дыстанцыйнай работы, але пры гэтым яна не была заканадаўча ўрэгулявана. Работадаўцы, як правіла, выкарыстоўвалі грамадзянска-прававыя дагаворы. Цяпер на яе распаўсюджваюцца працоўныя адносіны — гэта ўсё ж такі больш стабільны варыянт, які дае работніку больш гарантый.

На дыстанцыйную работу будуць распаўсюджвацца ўсе абавязковыя нормы: рэжым працы, абедзенны час, адпачынак, аплата часовай непрацаздольнасці. Але трэба разумець, што такі кантракт дзейнічае толькі на тэрыторыі Беларусі. «Калі работнік знаходзіцца на тэрыторыі іншай дзяржавы, то там таксама ёсць сваё заканадаўства. І той грамадзянін, які знаходзіцца на тэрыторыі іншай дзяржавы, павінен несці адказнасць, падпарадкоўвацца гэтаму заканадаўству. Наймальнік таксама павінен гэта разумець», — тлумачыць Валянціна Маслоўская.

ПРА МАТЭРЫЯЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ РАБОТНІКА

У новым Працоўным кодэксе зменена норма, якая датычыцца матэрыяльнай адказнасці работнікаў за прычыненую наймальніку шкоду. Раней наймальнік мог перакласці на работніка штраф, які на яго наклаў кантралюючы або наглядны орган. Пры гэтым сумы маглі быць велізарныя. Цяпер гэта выключана. Таксама новая рэдакцыя кодэкса канкрэтызуе, што з'яўляецца матэрыяльнай шкодай. Улічвацца будзе толькі рэальная шкода. Прычым калі яе памер не перавышае трох сярэднямесячных зарплат работніка, наймальнік мае права спагнаць яе ў адміністрацыйным парадку, не даводзячы справу да суда.

Працоўны кодэкс таксама ўраўноўвае матэрыяльную адказнасць работнікаў, якія працуюць па кантракце і па бестэрміновым працоўным дагаворы. Раней да кампенсацыі шкоды прыцягваліся толькі кантрактнікі, прычым незалежна ад таго, была яна нанесена выпадкова або наўмысна. Цяпер абмежаваная матэрыяльная адказнасць пашыраецца на ўсіх, а кампенсаваць страты давядзецца толькі ў выпадку іх наўмыснага стварэння.

ДАДАТКОВЫ ВОДПУСК ДЛЯ БАЦЬКІ ПРЫ НАРАДЖЭННІ ДЗІЦЯЦІ

У новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса прадугледжаны водпуск для бацькі або айчыма пры нараджэнні дзіцяці. Яго працягласць складзе 14 дзён, якія можна будзе выкарыстаць на працягу шасці месяцаў пасля нараджэння дзіцяці. Аплачвацца такі водпуск не будзе, таксама ён не будзе лічыцца часткай працоўнага водпуску. Пры гэтым у калектыўным дагаворы можна прапісаць пункт, які будзе прадугледжваць аплату дадзенага перыяду. Такім жа чынам можна павялічыць і працягласць гэтага водпуску.

У заканадаўства таксама ўвялі паняцце «адзінокі бацька». Мы ўжо бачым, што, акрамя адзінокіх жанчын, дзяцей выхоўваюць адзінокія мужчыны. На іх будуць пашырацца ўсе тыя ж гарантыі і нормы, што і на адзінокіх маці.

ЧЛЕНАМ ПРАФСАЮЗА — ПАШЫРАНЫЯ ПРАВЫ

Згодна з абноўленым Працоўным кодэксам, нормы калектыўнага дагавора будуць падзеленыя на асноўныя, якія датычацца ўсіх работнікаў — сюды ўваходзяць працягласць рабочага дня, час адпачынку, працоўны распарадак, сістэма аплаты працы і некаторыя іншыя істотныя пытанні, і дадатковыя нормы, якія будуць рэгулявацца праз калектыўны дагавор і датычыцца ў асноўным членаў прафсаюза.

Святлана БУСЬКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Магутны землятрус адбыўся на ўсходзе Турцыі

Загінула больш за два дзясяткі чалавек, больш за тысячу атрымалі раненні, паведаміла інфармагенцтва Reuters са спасылкай на ўпраўленне па прадухіленні і ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый пры ўрадзе Турцыі. Найбольшая колькасць ахвяр (18) адзначана ў правінцыі Элязыг, дзе знаходзіўся эпіцэнтр падземных штуршкоў. Чатыры чалавекі загінулі ў правінцыі Малацця. Паводле звестак міністра аховы здароўя Фахрэціна Коджы, медыцынская дапамога аказана прыблізна 130 пацярпелым пры завале дамоў. Пасля землятрусу зафіксавана 274 афтэршокі. Штуршкі адчуваліся ў прылеглых да Элязыга правінцыях і на поўначы Сірыі. У пацярпелыя раёны ідуць сотні грузавікоў з гуманітарнай дапамогай — прадуктамі, лекамі, коўдрамі і палаткамі. Тэмпература ўначы там апускаецца ніжэй за нуль. У правінцыі былі накіраваны дадатковыя машыны хуткай дапамогі і медыцынскія верталёты. Прэзідэнт Турцыі, які наведаў правінцыю Элязыг, паабяцаў, што ніхто не застанецца без прытулку. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Рэджэпу Таіпу Эрдагану.

Зорка баскетбола Кобі Браянт разам з дачкой разбіўся на верталёце

Славуты амерыканскі баскетбаліст Кобі Браянт загінуў у авіякатастрофе. Прыватны верталёт разбіўся непадалёк ад Лос-Анджэлеса. Як паведаміў навінавы партал TMZ, разам са спартсменам загінула яго 13-гадовая дачка. Прычынай крушэння верталёта мог стаць густы туман. Па звестках Los Angeles Times, борт ляцеў на малой вышыні з вялікай колькасцю паліва, таму пасля падзення ён загарэўся. Свае спачуванні выказаў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. 41-гадовага баскетбаліста называлі адным з самых паспяховых гульцоў НБА. Сярод яго трафеяў — два алімпійскія медалі і пяць перамог у рэгулярным баскетбольным чэмпіянаце. На працягу 20 сезонаў Кобі Браянт выступаў за каманду «Лос-Анджэлес Лэйкерс». Ён двойчы станавіўся самым выніковым гульцом сезона і 18 разоў удзельнічаў у матчах усіх зорак. Аб завяршэнні кар'еры Браянт абвясціў у 2016 годзе.

Навукоўцы аднавілі голас 3000-гадовай мумііі

Брытанскім навукоўцам удалося аднавіць голас егіпецкага жраца Несьямуна, памерлага каля 3000 гадоў таму. Дзякуючы таму, што ў мумііі добра захаваліся галасавыя звязкі і гартань, даследчыкі змаглі стварыць трохмерную мадэль яго глоткі, языка, звязак і іншых органаў, якія затым раздрукавалі з дапамогай 3D-прынтара. Такім чынам брытанскія навукоўцы выканалі апошняе жаданне жраца. «На саркафагу Несьямуна можна прачытаць, што яго ўладальнік прасіў багоў вярнуць яму здольнасць гаварыць для таго каб ён мог расказаць пра сябе і заслужыць права на вечнае замагільнае жыццё», — паведамілі яны. Праўда, пакуль мумія не здольная прамаўляць паўнавартасныя словы і фразы — замест гэтага яна выдае гук, падобны на «э».

Несьямун жыў у часы Рамсеса XI. Ён памёр ва ўзросце прыкладна 50 гадоў. Мумію знайшлі на тэрыторыі храма бога Амона ў Карнаке. З 1820-х гадоў яна захоўваецца ў музеі брытанскага горада Лідса. Падчас Другой сусветнай нямецкімі бамбардзіроўкамі былі знішчаны шматлікія экспанаты музея, але мумііі цудам удалося перажыць вайну.